# *ПАКУТА, ЗАПАЛ, УЗБУДЖЭННЕ, НАТХНЕННЕ*

**17 студзеня на занятках Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы спрабавалі даследаваць паняцце «пафас». Павучыліся адрозніваць віды, тыпы пафасу і сродкі яго мастацкага выражэння. Кожны аўтар пры дапамозе калег вызначыў галоўны пафас сваёй творчасці. На прыкладзе ўласнага творчага вопыту зрабілі і іншыя высновы.**



Галоўная з іх: пафас як мастацкую з'яву не варта пераацэньваць. Аднак і без гэтага яскравага свету эмоцый і пачуццяў не магчыма ўявіць свет літаратуры. Заняткі па традыцыі складаліся з трох блокаў – тэарэтычнага, практычнага і аналітычнага. У рамках першага блока пазнаёміліся з азначэннямі пафасу (ад грэчаскага *pathos* – пакута, запал, узбуджэнне, натхненне). На практыцы пашукалі разам адказы на пытанні: «Да чаго ў большай ступені адносіцца пафас – да зместу або да формы твора? Што ў першую чаргу дапамагае вызначыць пафас? Ці магчымая яго поўная адсутнасць у тэксце? Чаму на абывацельскім узроўні пафас часцяком выклікае раздражненне?» і іншыя.

Сярод станоўчых момантаў мерапрыемства трэба назваць удзел у занятках новых людзей і вяртанне да актыўнай літаратурнай дзейнасці ўжо добра знаёмых калег. Дарэчы, некаторыя тэксты, напісаныя экспромтам у практычным блоку, заслугоўваюць даволі высокіх ацэнак. Адмоўныя моманты студзеньскіх заняткаў – нізкая ўвага да грамадска-адукацыйнага праекта з боку калектыва Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, поўная адсутнасць пішучай моладзі.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На здымках:** офіс Саюза пісьменнікаў Беларусі ў Гродне. Ідуць заняткі Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы. Тэма: «Пафас: свет эмоцый і пачуццяў». 17 студзеня 2023 года.






**Выступае аўтар трох кніг, беларускі празаік Ірына Салата**



Празаік, паэтэса Кацярына Калік і дзіцячая пісьменніца Вольга Дзіканава


Дэбютант Гродзенскай грамадскай літаратурнай школы, паэтка Анастасія Токарава-Самушчык


Таксама ўпершыню на занятках паэт Андрэй Бортнік





Паэтэса Алена Чэпукене





Паэтэса Наталля Солтан



Паэты Анатоль Апанасевіч (СПБ)



**і Дзмітрый Радзівончык (СПБ)**




**Паэтэсы Таццяна Лугавая і Ірына Полудзень**





**Адразу з некалькімі творамі выступіла кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаб’яднання «Надзея», паэтэса Святлана Глембоцкая**



**Усе разам**



*Фота* **Анатоля Апанасевіча**